БАНК ІДЭЙ

Funded by the European Union

# Гендарная чуллівасць ў крымінальным працэсе аўтарытарнай дзяржавы:

*нормы, практыкі і магчымасці для рэформ*

Лілія Беразюк, красавік 2026



BELARUS YOUNG RESEARCH AWARD

**WINNER**

2025

# УВОДЗІНЫ: ГЕНДАРНАЯ АДЧУВАЛЬНАСЦЬ ЯК ІНДЫКАТАР ЯКАСЦІ ПРАВАСУДДЗЯ

У аўтарытарнай сістэме крымінальны працэс часта становіцца інструментам палітычнага ціску і кантролю, і фактычна не забяспечвае належнай абароны ўдзельніц і ўдзельнікаў. Залежнасць судоў і следчых органаў, закрытасць працэдур і выбарачнае правапрымяненне павышаюць рызыку.

Беларусь фармальна замацоўвае роўнасць усіх перад законам у Канстытуцыі і працэсуальным заканадаўстве. На практыцы аднолькавыя працэсуальныя нормы і працэдуры могуць працаваць па-рознаму ў залежнасці ад гендарных стэрэатыпаў і кантэксту іх прымянення.

Гэта праяўляецца, напрыклад, у допытах без належнай канфідэнцыйнасці, у віктымблеймінгу пры ацэнцы паказанняў і ў адсутнасці працэдур, якія прадухіляюць рэтраўматызацыю. У выніку жанчыны ў статусе пацярпелых, сведак і абвінавачаных могуць сутыкацца з недаверам, стэрэатыпізацыяй паводзінаў, ціскам і прыніжэннем.

Ключавая праблема — разрыў паміж дэклараванай роўнасцю і рэальнымі гарантыямі абароны. З пачатку палітычнага крызісу рэпрэсіі ў Беларусі трансфармаваліся ад патэрналісцкіх рэакцый да ўніфікаванага ціску, пры якім фактары ўразлівасці (дзеці, сямейныя сувязі, сацыяльныя ролі і стэрэатыпы) могуць выкарыстоўвацца як дадатковыя інструменты кантролю.

Пасля 2020 года беларуская крымінальная юстыцыя дэ-факта стала часткай рэпрэсіўнага механізму, які закрануў тысячы жанчын — актывістак, журналістак, валанцёрак і ўдзельніц пратэстаў. Паводле дадзеных незалежнага дакладу для Камітэту ААН па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (CEDAW), з 2020 года зафіксавана не менш за 19 800 выпадкаў палітычна матываванага праследу жанчын і 2 989 крымінальных спраў. На 6 студзеня 2025 года сярод 1 260 палітвязняў — 168 жанчын, а агульная колькасць жанчын, якія прайшлі праз палітычнае зняволенне, дасягнула 514[1].

Такім чынам, у гэтай тэме можна вылучыць дзве ўзаемазвязаныя праблемы. Па-першае, у самім крымінальным працэсе фарміруюцца дыскрымінацыйныя практыкі, калі фармальна нейтральныя нормы ў спалучэнні з інстытуцыйнымі стэрэатыпамі і практыкамі правапрымянення прыводзяць да няроўных наступстваў для жанчын. Пад дыскрымінацыйнымі практыкамі ў гэтым тэксце разумеюцца практыкі абыходжання і працэсуальныя рашэнні, якія ўзмацняюць уразлівасць жанчын, павышаюць рызыку другаснай віктымізацыі або выкарыстоўваюць гендарныя стэрэатыпы як аргумент, спосаб дыскрэдытацыі або інструмент ціску. У выніку жанчыны могуць апынацца ў сітуацыі дыскрымінацыі адначасова па палітычнай і гендарнай прыкмеце.

Па-другое, пасля 2020 года істотна аслабла недзяржаўная інфраструктура падтрымкі, якая раней часткова кампенсавала дэфіцыты дзяржаўнай сістэмы. Пад недзяржаўнай інфраструктурай падтрымкі маецца на ўвазе сетка незалежных ініцыятыў і арганізацый грамадзянскай супольнасці (гарачыя лініі, шэлтары, юрыдычнае і псіхалагічнае суправаджэнне, адукацыйныя і адвакацыйныя праекты), якія забяспечваюць канфідэнцыйны і траўма-інфармаваны доступ да дапамогі па-за дзяржаўнымі інстытутамі.

Пасля масавых ліквідацый НДА, крыміналізацыі грамадзянскай актыўнасці і выціскання арганізацый у эміграцыю значная частка гэтай інфраструктуры была знішчана або істотна аслаблена. У выніку жанчыны значна часцей застаюцца без бяспечных маршрутаў дапамогі і незалежнага суправаджэння.

1. Справаздача аб выкананні Рэспублікай Беларусь Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх форм дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын / падрыхтавана кааліцыяй беларускіх НДА і ініцыятыў; Беларускі Хельсінкскі Камітэт [і інш.]. — 2025. — 20 с. — (Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (CEDAW), 90-я сесія).

Разам гэтыя два фактары (распаўсюджанне дыскрымінацыйных практык у крымінальным працэсе і аслабленне незалежнай сістэмы падтрымкі) робяць гендарную адчувальнасць не другаснай тэмай, а важным крытэрыем ацэнкі правасуддзя. Тое, наколькі крымінальны працэс здольны ўлічваць гендарныя рызыкі, прадухіляць рэтраўматызацыю і забяспечваць роўны доступ да абароны, паказвае, ці выконвае прававая сістэма сваю асноўную функцыю — абарону годнасці чалавека і справядлівы разгляд спраў, або ператвараецца ў механізм кантролю і пакарання.

**Мэта даследавання** — прааналізаваць, як нормы і практыкі крымінальнага працэсу ўплываюць на жанчын у Беларусі ў розных працэсуальных статусах (пацярпелых, сведак, абвінавачаных) і якія сістэмныя дэфіцыты неабходна ўлічваць для выпраўлення сітуацыі.

Даследаванне грунтуецца на міждысцыплінарным падыходзе, які спалучае прававы, гендарны і палітыка-сацыялагічны аналіз. У фокусе знаходзяцца нарматыўнае рэгуляванне крымінальнага працэсу і практыка яго прымянення з улікам уплыву палітычнага кантэксту, а таксама сацыяльных і інстытуцыйных стэрэатыпаў. У працы выкарыстоўваецца сукупнасць метадаў: аналіз адкрытых крыніц і дакументаваных выпадкаў (рэальныя справы і даклады праваабарончых арганізацый), параўнальны аналіз міжнародных стандартаў, агляд публічных наратываў і медыйнай рыторыкі, а таксама інтэрв’ю з эксперт_камі (праведзена 14 паўструктураваных інтэрв’ю з юрыст_камі, праваабаронцамі і даследчы_цамі). З меркаванняў бяспекі ўсе прыклады ў тэксце прыводзяцца ў абагульненым выглядзе.

# ПАЛІТЫЗАЦЫЯ КРЫМІНАЛЬНАГА ПЕРАСЛЕДУ ЖАНЧЫН

Пасля 2020 года крымінальны працэс у Беларусі дэ-факта стаў часткай рэпрэсіўнага механізму, у якім правапрымяненне выкарыстоўваецца не толькі для расследавання злачынстваў, але і для кантролю і запалохвання. Палітызацыя праяўляецца не адным «інструментам», а ўзаемазвязанай сістэмай механізмаў: ад заканадаўчых зменаў і антыэкстрэмісцкіх практык да абыходу гарантый абароны, інфармацыйнай легітымацыі пераследу і ціску праз сацыяльныя ролі. Для жанчын гэта мае дадатковыя наступствы: уразлівасці, звязаныя з мацярынствам, сямейнымі абавязкамі, стыгмай і гендарнымі стэрэатыпамі, робяцца часткай логікі пераследу, а знішчэнне незалежнай інфраструктуры падтрымкі звужае магчымасці для бяспечнай абароны.

Ніжэй вылучаны асноўныя шляхі (механізмы) палітызацыі крымінальнага пераследу ў Беларусі.

## 1. Выкарыстанне антыэкстрэмісцкага і антытэрарыстычнага заканадаўства для падаўлення іншадумства

З жніўня 2020 года антыэкстрэмісцкае заканадаўства ў Беларусі стала адным з ключавых інструментаў пераследу жанчын: не менш за 1 140 жанчын асуджана за «экстрэмісцкія» злачынствы, а 5 019 прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці[2]. Адным з індыкатараў маштабу рэпрэсій з'яўляецца статыстыка па арт. 130 КК Рэспублікі Беларусь: за 2016–2020 гады па ім асуджана 36 чалавек, з 2020 па 2023 — не менш за 447. Справы часта разглядаюцца ў закрытым рэжыме, а пакаранне звычайна звязана з пазбаўленнем волі, што вядзе да пажыццёвай стыгматызацыі, страты працы і абмежавання доступу да публічных пасад[3].

Увядзенне інстытута спецыяльнай вытворчасці ў Крымінальна-працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь (ліпень 2022) дазволіла праводзіць завочныя суды. На 1 студзеня 2025 года спецвытворчасць была ініцыявана супраць 147 чалавек, значную частку якіх складаюць жанчыны, якія займалі бачныя пазіцыі ў палітычнай і грамадскай сферы, і былі вымушаныя пакінуць краіну[4]. Пазнейшыя ацэнкі праваабарончых арганізацый сведчаць, што да канца кастрычніка 2025 года ў афіцыйным Спісе асоб, у дачыненні да якіх вядзецца спецыяльная вытворчасць, налічвалася ўжо 162 чалавекі[5].

Практыка прымянення спецыяльнай вытворчасці сведчыць пра сістэмныя парушэнні правоў абвінавачаных жанчын: абмежаванне доступу да абароны[6], інфармацыйную ізаляцыю[7] і маёмасны ціск[8]. На практыцы гэта азначае, што прызначаныя дзяржавай абаронцы могуць дзейнічаць фармальна, а канфіскацыя маёмасці становіцца інструментам прымусу.

2. Справаздача аб выкананні Рэспублікай Беларусь Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх форм дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын / падрыхтавана кааліцыяй беларускіх НДА і ініцыятыў; Беларускі Хельсінкскі Камітэт [і інш.]. — 2025. — 20 с. — (Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (CEDAW), 90-я сесія).

3. Справаздача арганізацый грамадзянскай супольнасці аб выкананні Рэспублікай Беларусь палажэнняў Міжнароднай канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх форм расавай дыскрымінацыі : 113-я сесія Камітэта па ліквідацыі расавай дыскрымінацыі / Беларускі Хельсінкскі Камітэт, Human Constanta [і інш.]. — 2024. — 24 с.

4. Спецыяльнае справаводства у крымінальным працэсе Беларусі : маніторынг выкарыстання механізма «in absentia» (без удзелу абвінавачанага) / Беларускі Хельсінкскі камітэт [і інш.]. — 2025. — 107 с.

5. Monitoring of the situation with freedom of association and the status of civil society organisations in Belarus / Lawtrend. — 2025. — Перыяд маніторынгу: жнівень–кастрычнік 2025 г. — (дата звароту: 15.03.2026).

6. UN Experts: Lawyers in Belarus face unprecedented repression in a climate of fear // DefendersBelarus.org, 22.01.2025. (дата звароту: 15.03.2026);
Belarus: UN experts alarmed about widespread in absentia trials // Office of the UN High Commissioner for Human Rights, 22.01.2025. (дата звароту: 15.03.2026).

У міжнародных аглядах практыка завочных палітычных працэсаў у Беларусі разглядаецца як элемент транснацыянальных рэпрэсій супраць апанентак рэжыму, у тым ліку журналістак, праваабароніцаў і культурных дзеячак, якія працягваюць дзейнасць у выгнанні[9].

## 2. Маралізатарская рыторыка і легітымацыя рэпрэсій

Даследаванні дзяржаўнага дыскурсу паказваюць, што канцэпт «традыцыйных каштоўнасцяў» выкарыстоўваецца не толькі як культурны маркер, але і як *палітычны інструмент*, які вызначае «нармальную» ролю жанчыны і адначасова дыскрэдытуе жанчын у публічнай і палітычнай сферах.

Маніторынгі Media IQ паказваюць, што дзяржаўныя медыя канструююць «правільную» ролю жанчыны праз вобразы маці і «ахоўніцы традыцыйных каштоўнасцяў» і ўзмацняюць патрабаванне ідэалагічнай лаяльнасці[10]. У даследаваннях гэта апісваецца як «гендарны папулізм», які ўлады выкарыстоўваюць для легітымацыі патрыярхальных наратываў[11].

У такой рамцы мацярынства пазіцыянуецца як «вышэйшае прызначэнне», а палітычная актыўнасць — як нешта другаснае, «няправільнае» або дэвіянтнае; патэрналісцкі дыскурс прадстаўляе правы жанчын як «дар дзяржавы», а фемінізм і альтэрнатыўныя мадэлі паводзінаў стыгматызуюцца як пагроза стабільнасці[12].

Гэтая логіка праяўляецца і ў сведчаннях эксперт_ак: жаночая грамадзянская актыўнасць зневажаецца праз зводжанне жанчыны да «побытавай» функцыі і публічнае прыніжэнне. Адна з эксперт_ак апісвае гэта як прамую дыскрымінацыйную формулу:

> «...*Идут дискриминационные вещи из категории утверждения “ты зачем там ходишь, тебе борщи варить”... То есть всячески унижаются женщины и сводятся к функции деторождения и обустройству быта*».

Іншая эксперт_ка падкрэслівае, што менавіта такая нарматыўная карцінка («жанчыны павінны быць у прыватнай сферы») выкарыстоўваецца як элемент дзяржаўнай палітыкі, якая «выключае» жанчын з грамадзянскай функцыі:

> «...*Что женщины должны варить борщи. ...Мы должны менять политику государства и устранять безнаказанность за лишение женщин той гражданской функции, которую она могла бы реализовать в нормальных условиях*».

---

7. Belarus: UN experts alarmed about widespread in absentia trials // OHCHR, 22.01.2025. (дата звароту: 15.03.2026);
Authoritarianism Without Borders: Belarus and Transnational Repression in Central and Eastern Europe / Blue Europe, 23.09.2025. Раздзел 3.4 «Trials in Absentia». (дата звароту: 15.03.2026).

8. Authoritarianism Without Borders: Belarus and Transnational Repression in Central and Eastern Europe / Blue Europe, 23.09.2025. Раздзел 3.4 «Trials in Absentia» (канфіскацыя маёмасці, эканамічны ціск на выгнаннікаў). (дата звароту: 15.03.2026);
A prison of the mind: Lukashenka's pursuit of exiled Belarusians / European Council on Foreign Relations, 29.01.2023. (дата звароту: 15.03.2026).

9. Belarus: UN experts alarmed about widespread in absentia trials // OHCHR, 22.01.2025. (дата звароту: 15.03.2026);
Belarus opens criminal cases against more than 60 journalists in exile / Committee to Protect Journalists, 11.05.2025. (дата звароту: 15.03.2026);
Monitoring of violations of cultural rights and human rights of cultural workers in Belarus / PEN Belarus, 12.02.2026. (дата звароту: 13.03.2026).

10. Воляк, А. Даследаванне: «Патрыётка, абаронца традыцыйных каштоўнасцяў» — роля жанчыны ў дзяржаўных медыя / А. Воляк // Media IQ. — 2024. — 29 ліпеня. — (дата звароту: 10.03.2026).
Сідорская, І. Беларускія СМІ прадэманстравалі прагрэс у гендарнай карэктнасці / І. Сідорская, П. Быкоўскі // Media IQ. — 12 лютага 2024. — (дата звароту: 15.03.2026).

11. Саламаціна, І. Гендерный популизм в Беларуси / І. Саламаціна, В. Шмідт // Неприкосновенный запас. 2021. № 1 (135). (дата звароту: 13.03.2026)

12. Воляк, А. Даследаванне: «Патрыётка, абаронца традыцыйных каштоўнасцяў» — роля жанчыны ў дзяржаўных медыя / А. Воляк // Media IQ. — 2024. — 29 ліпеня. — (дата звароту: 10.03.2026).

У выніку маралізатарская рыторыка становіцца часткай легітымацыі пераследу: яна замацоўвае вобраз «сапраўднай патрыёткі» як паслухмянай маці і «нармальнай жанчыны», а жанчын-апанентак дэгуманізуе і прадстаўляе як «адхіленне» ад нормы. Гэта, у сваю чаргу, ўплывае і на крымінальны працэс, калі гендарныя стэрэатыпы пачынаюць працаваць як дадатковы механізм дыскрэдытацыі і ціску.

## 3. Уніфікацыя ціску: пераход ад патэрналізму да «аднолькавага» пераследу

Аналіз інтэрв'ю выяўляе эвалюцыю рэпрэсіўнай практыкі: ад патэрналісцкага падыходу на пачатку пратэстаў да знешне ўніфікаваных рэпрэсій, калі жанчын пачынаюць пераследаваць «як мужчын» — праз тыя ж артыкулы, тыя ж інструменты запалохвання і тыя ж «стандарты» (у тым ліку адсутнасць эфектыўнай абароны). Гэтую змену добра ілюструюць выказванні эксперт_ак з інтэрв'ю:

> «...*Раньше к женщинам, я бы сказала, более мягкое отношение было. Их воспринимали либо как глупышек-блондинок, либо как домохозяек. Сейчас они, в принципе, наравне с мужчинами — враги народа*».
>
> «*Но, что очень важно для меня, это то, что после 20-го года женщины, собственно, попали вот в этот [пул] и стали тоже целевой группой репрессий*».

## 4. Паслабленне інстытутаў абароны і нагляду

Інтэрв'ю паказваюць, што сістэма абароны правоў у палітычных справах пасля 2020 года перастала працаваць. Гэта выяўляецца ў двух узаемазвязаных зрухах: па-першае, *дэ-факта страце незалежнасці адвакатуры і магчымасці забяспечваць эфектыўную абарону* і, па-другое, *аслабленні пракурорскага нагляду за законнасцю дзеянняў следства і ўмоў утрымання*.

У частцы адвакатуры эксперт_ка падкрэслівае, што рэпрэсіі супраць адвакатаў і залежнасць тых, хто застаўся ў прафесіі, робяць размову пра незалежную абарону амаль немагчымай:

> «...*У нас отсутствуют органы независимой адвокатуры, потому что адвокаты подвергались жесточайшим репрессиям, и на сегодня любой адвокат, продолжающий практику, вынужден соглашаться и, условно, прогибаться под эту систему. Говорить в таких условиях о независимости этого представителя не приходится. ...Многие не берутся за политические дела*».

У частцы нагляду яшчэ адно інтэрв'ю фіксуе змену практыкі пасля 2020 года: калі пракуратура перастае дзейнічаць як рэальны абмежавальнік, следчыя ўспрымаюць гэта як «адсутнасць межаў» пры парушэнні правоў:

> «...*С 2020 года прокуратура перестала действовать как надзорный орган, и многие следователи поняли, что у них нет ограничений при нарушении прав задержанных, подозреваемых, обвиняемых*».

У выніку абмежаванні доступу да адваката, кантакту з блізкімі і механізмы абскарджання ўсё часцей маюць фармальны характар, а парушэнні працэсуальных правоў ператвараюцца ў «нармальнасць» для палітычна матываваных спраў.

## 5. Працэдуры і статусы выкарыстоўваюцца для абыходу гарантый

Аналіз інтэрв'ю дэманструе маніпулятыўнае выкарыстанне працэсуальных статусаў і працэдур для абыходу прававых гарантый. Тыповая схема ўключае допыт жанчыны ў якасці сведкі, адміністрацыйнае затрыманне з наступным утрыманнем без гарантый, прадугледжаных для падазраваных, і магчымы пераход да крымінальнага пераследу.

Статус сведкі ў такой канструкцыі можа быць асабліва ўразлівым: фармальна чалавек «дапамагае следству», але фактычна не мае тых гарантый, якія мае падазраваная асоба (перш за ўсё — доступу да абароны і

магчымасці адразу выбудоўваць пазіцыю). На практыцы гэта ператвараецца ў «шэрую зону», калі допыт як сведкі спалучаецца з вобшукам, канфіскацыяй тэхнікі і наступнай ізаляцыяй у межах адміністрацыйнага працэсу. Такая ізаляцыя вырашае адразу некалькі задач: абмяжоўвае кантакт з адвакатам і блізкімі, стварае моцны псіхалагічны ціск і дае час на аналіз канфіскаваных прыладаў і камунікацый. Гэты механізм наўпрост апісваецца ў адным з экспертных інтэрв'ю: «Это отвратительно, потому что если у вас есть подозрения, то вы должны допрашивать в качестве подозреваемого, потому что тогда есть гарантии».

«Вісячыя» або прыпыненыя справы ў сваю чаргу выкарыстоўваюцца як інструмент пастаяннага кантролю і ціску, пакідаючы жанчыну ў стане нявызначанасці адносна рызык наступнага пераследу.

Асаблівы выпадак — хатні гвалт: зварот у міліцыю па дапамогу можа стаць трыгерам для «праверкі» і, у пэўных умовах, для пераследу жанчыны (напрыклад, калі яе можна звязаць з пратэстнай актыўнасцю), што фактычна робіць маршрут абароны небяспечным.

Такім чынам, маніпуляцыя працэсуальнымі статусамі (сведка / падазраваная) і выкарыстанне сумежных працэдур (адміністрацыйнае затрыманне, вобшук і канфіскацыя тэхнікі, допыт без доступу да абароны, наступны «пераход» у крымінальны працэс) ствараюць прававую нявызначанасць і дазваляюць абыходзіць гарантыі, прадугледжаныя для падазраваных.

## 6. Ціск праз мацярынства і дзяцей

Дзяржава мэтанакіравана эксплуатуе мацярынства для падаўлення палітычнай актыўнасці жанчын. Пагроза разлучэння з дзецьмі або пазбаўлення бацькоўскіх правоў дзейнічае як інструмент запалохвання. Інтэрв'ю паказваюць, што мацярынства і дзеці выкарыстоўваюцца як спецыфічна гендарны механізм ціску на жанчын: уразлівасць, звязаная з клопатам пра дзіця і рызыкай разлучэння, павялічвае прымусовую сілу пагроз і рашэнняў дзяржавы. У гэтай логіцы «нейтральныя» для ўсіх інструменты (затрыманне, змяшчэнне пад варту, абмежаванне кантактаў) для жанчыны-маці атрымліваюць дадатковы каральны эфект — праз страту магчымасці быць з дзіцем і кантраляваць яго бяспеку.

Адна з эксперт_ак у інтэрв'ю апісвае тыповую практыку: пры затрыманні жанчыны дзіця могуць змясціць ва ўстанову нават пры наяўнасці сваякоў. Яна таксама падкрэслівае гендарную асіметрыю наступстваў: калі затрымліваюць мужчыну, догляд звычайна перакладаецца на маці:

> *«В случае, если женщина задерживается, ребенка помещают в учреждение, несмотря на наличие близких или других родственников. ...Обратите внимание на то, что с мужчинами такого нет. Если мужчина задерживается и заключается под стражу, забота о ребенке ложится на мать. То есть базовая функция материнства под ударом. Для женщины это наказание...»*

Такім чынам, мацярынства ператвараецца ў пункт уразлівасці, які дзяржава можа мэтанакіравана эксплуатаваць для падаўлення палітычнай (альбо нават грамадзянскай) актыўнасці жанчын. Пагроза разлучэння з дзецьмі або пазбаўлення бацькоўскіх правоў у такіх умовах дзейнічае як асабліва моцны інструмент запалохвання.

# ГЕНДАРНЫЯ СТЭРЭАТЫПЫ Ў ПРАЦЭСУАЛЬНЫХ РОЛЯХ

Аналіз інтэрв'ю і праваабарончых справаздач выяўляе сістэмныя патэрны гендарнай дыскрымінацыі, якія праяўляюцца па-рознаму ў залежнасці ад працэсуальнага статусу жанчыны.

## 1. Жанчыны-пацярпелыя: сістэмныя бар'еры, стэрэатыпы і абмежаваны доступ да абароны

Аналіз інтэрв'ю і праваабарончых справаздач паказвае, што жанчыны-пацярпелыя сутыкаюцца з шэрагам інстытуцыйных бар'ераў, якія абмяжоўваюць эфектыўную абарону іх правоў і супярэчаць міжнародным стандартам, замацаваным, у прыватнасці, у Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх форм дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (CEDAW) і Стамбульскай канвенцыі. Праблема праяўляецца не толькі ў асобных працэсуальных парушэннях, але і ў самой канструкцыі прававога рэгулявання і практыцы правапрымянення, якія часта не ўлічваюць гендарныя асаблівасці гвалту.

Адным з ключавых фактараў з'яўляецца разрыў паміж разуменнем сексуальнага гвалту праз (не)згоду і дзеючай крымінальна-прававой мадэллю, якая арыентуецца на доказы фізічнага прымусу або пагроз. Таму выпадкі псіхалагічнага прымусу (страх, залежнасць, шантаж) часта не атрымліваюць належнага расследавання, а пацярпелыя сутыкаюцца з дадатковымі рызыкамі. Гэта таксама стварае рызыку сустрэчнага абвінавачвання ўілжывым даносе, што дзейнічае як фактар запалохвання і стрымлівае частку пацярпелых ад звароту ў праваахоўныя органы.

Дадатковай праблемай становіцца працэсуальная другасная віктымізацыя, якая ўзнікае ў ходзе следчых дзеянняў. Інтэрв'ю паказваюць, што ў беларускай практыцы часта адсутнічаюць базавыя ўмовы канфідэнцыяльнасці і бяспекі для пацярпелых, а сам працэс допыту можа адбывацца ў абставінах, якія ўзмацняюць траўматычны досвед. Адна з эксперт_ак апісвае гэта наступным чынам:

> *«Так проводится допрос. У нас кабинет небольшой: в одном углу сидит один следователь, в другом углу сидит следователь, в том углу следователь допрашивает свидетеля по грабежу, а вот здесь у нас проводится допрос по изнасилованию. Ну то есть какой-то конфиденциальности, уединения точно нет».*

Траўматычны эфект узмацняецца і выкарыстаннем працэсуальных механізмаў, якія прадугледжваюць прамое сутыкненне пацярпелай з абвінавачаным. Напрыклад, адна з эксперт_ак апісвае сітуацыю, калі цяжарная жанчына-пацярпелая была вымушаная ўдзельнічаць у вочнай стаўцы:

> *«Ужасная ситуация была в том, что это была очная ставка. Получается, я, этот обвиняемый, следователь и эта потерпевшая. А потерпевшая в тот момент была беременна. ...То есть она только пережила вот это все. ...Она была в состоянии беременности».*

Гэтыя прыклады паказваюць, што ў беларускай практыцы адсутнічаюць устойлівыя траўма-інфармаваныя працэдуры працы з пацярпелымі ад гендарна-абумоўленага гвалту.

Асабліва выразна гэтыя праблемы праяўляюцца ў справах пра хатні гвалт, дзе пацярпелая часта знаходзіцца ў сітуацыі сацыяльнай або эканамічнай залежнасці ад агрэсара. Маніторынгі і даклады праваабарончых арганізацый паказваюць, што дзяржаўныя інстытуты ў такіх выпадках нярэдка дзейнічаюць фармальна, перакладаючы частку адказнасці на саміх пацярпелых або абмяжоўваючыся мінімальнымі працэсуальнымі дзеяннямі. Паводле дакладу кааліцыі беларускіх НДА, у некаторых сітуацыях праваахоўныя органы больш уважліва сочаць за палітычнай актыўнасцю жанчын, якія звяртаюцца па дапамогу, чым за рэальным прыняццем мер абароны і прыцягненнем агрэсараў да адказнасці. У тых жа дакументах адзначаецца, што значная частка спраў пра хатні гвалт у Беларусі працягвае разглядацца ў форме прыватнага абвінавачвання.

Дзяржаўная статыстыка па такіх злачынствах застаецца закрытай, а падрыхтоўка спецыялістаў у сферы гендарна-чуллівай працы носіць фрагментарны характар[13].

Яшчэ адным сістэмным бар'ерам з'яўляецца абмежаваны доступ пацярпелых да незалежнай юрыдычнай дапамогі і прадстаўніцтва асабліва на ранніх стадыях крымінальнай справы, калі фарміруецца доказная база. Гэта найбольш востра закранае жанчын з маргіналізаваных груп (у тым ліку рома і жанчын з ментальнымі асаблівасцямі), для якіх фармальна даступныя механізмы абароны часта застаюцца фактычна недасягальнымі. Гэтую праблему непасрэдна адзначаюць эксперт_кі ў інтэрв'ю:

> *«Нету возможности женщине, находящейся в таком уязвимом положении, иметь представителя за счет государства».*
>
> *«...Вот, например, право иметь представителя, да, у потерпевших... Это тоже нужны деньги... Но когда денег у тебя нет, получается, ты зависишь от судьи и от обвинения».*

У выніку ўзнікае структурная няроўнасць бакоў паміж дзяржаўным апаратам расследавання і абвінавачвання і пацярпелай, якая не заўсёды мае доступ да незалежнай падтрымкі і бяспечных працэсуальных умоў.

## 2. Жанчыны-сведкі: працэсуальная ўразлівасць ва ўмовах абвінаваўчага ўхілу і палітызацыі крымінальнага працэсу

Паводле дадзеных інтэрв'ю, дыскрымінацыя жанчын-сведак рэдка выглядае як прамая недаверлівасць да паказанняў «бо яна жанчына». Аднак у палітызаваным і абвінаваўча арыентаваным працэсе жанчыны-сведкі могуць быць структурна больш уразлівымі з-за спалучэння двух фактараў: сведка мае менш працэсуальных гарантый, чым падазраваная, і жанчыны часцей апынаюцца ў сітуацыях залежнасці і рызыкі (сямейны кантроль, дзеці, эканамічная залежнасць, страх стыгматызацыі), што робіць ціск праз «сведчанне» больш эфектыўным.

Гэтая ўразлівасць узмацняецца ў сітуацыях, калі следства выкарыстоўвае статус сведкі як «шэрую зону» для збору інфармацыі без прадастаўлення поўнага набору працэсуальных гарантый. У такіх выпадках чалавек фармальна выступае сведкам, але фактычна ўжо знаходзіцца ў сітуацыі падазрэння, не маючы доступу да абаронцы і магчымасці выбудоўваць прававую пазіцыю.

Для жанчын такая працэсуальная нявызначанасць часта спалучаецца з сацыяльнымі ўразлівасцямі: эканамічнай залежнасцю, адказнасцю за дзяцей, рызыкай стыгматызацыі або кантролем з боку партнёра. У выніку ціск праз «сведчанне» можа быць больш эфектыўным, а сама працэдура стымулюе самацэнзуру, маўчанне або «зручныя» паказанні.

Як адзначае адна з суразмоўніц, асабісты досвед знаходжання ў статусе сведкі можа ператварацца ў працяглую сітуацыю нявызначанасці і псіхалагічнага ціску:

> *«Я была как свидетельница по уголовному делу задержана... И мы не знали, будет уголовное дело возбуждено или меня отпустят».*

## 3. Жанчыны-абвінавачаныя і асуджаныя: двайная стыгматызацыя і гендарна-спецыфічныя формы рэпрэсій

Жанчыны-абвінавачаныя і асуджаныя сутыкаюцца з феноменам двайной стыгматызацыі: яны ўспрымаюцца не толькі як асобы, якія здзейснілі злачынствы, але і як жанчыны, што парушылі сацыяльныя чаканні адносна «правільнай» жаночай ролі — мацярынства, сямейнай адказнасці і прысутнасці ў прыватнай сферы.

---

13. Belarusian Helsinki Committee. Belarus: Implementation of SDG 16 "Peace, Justice and Strong Institutions". 2025. 32 p.; Справаздача аб выкананні Рэспублікай Беларусь Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх форм дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын / падрыхтавана кааліцыяй беларускіх НДА і ініцыятыў; Беларускі Хельсінкскі Камітэт [і інш.]. — 2025. — 20 с. — (Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (CEDAW), 90-я сесія).

Праваабарончыя маніторынгі фіксуюць, што гэтая логіка праяўляецца і ў паводзінах супрацоўнікаў месцаў пазбаўлення волі. У размовах з жанчынамі выкарыстоўваюцца маралізатарскія формулы накшталт «сядзець дома», «выходзіць замуж» або «нараджаць дзяцей», а маці могуць падвяргацца псіхалагічнаму ціску праз ацэнкі іх як «благіх маці»[14].

Асобную групу праблем складаюць практыкі, якія фактычна выкарыстоўваюць жаночае цела і фізіялагічныя патрэбы як інструмент кантролю і прыніжэння. Падчас асабістых ператрусаў жанчын могуць прымушаць цалкам распранацца і некалькі разоў прысядаць; такія працэдуры часам адбываюцца ў прысутнасці мужчын-супрацоўнікаў або пад відэаназіраннем. Асабліва траўматычнымі становяцца сітуацыі падчас менструацыі, калі жанчын прымушаюць выкідваць гігіенічныя сродкі або вымаць тампон у прысутнасці лекара-мужчыны. Парушэнні прыватнасці працягваюцца і ў паўсядзённых умовах утрымання. У некаторых ізалятарах туалеты не адгароджаныя, і супрацоўнікі могуць назіраць за жанчынамі праз дзвярныя вочка. Дадатковую праблему стварае дэфіцыт гігіенічных умоў: доступ да душа можа адсутнічаць да 30 сутак, а сродкі асабістай гігіены выдаюцца ў недастатковай колькасці — напрыклад, «па 1–2 пракладкі на дзень» або «10 штук на месяц» у калоніях[15].

Умовы зняволення ўзмацняюць і іншыя формы гендарнай уразлівасці, уключаючы ціск праз мацярынства і разлуку з дзецьмі. У асобных выпадках ціск праз дзяцей выкарыстоўваецца і як інструмент унутры сямейных канфліктаў, калі пагроза крымінальнага пераследу становіцца спосабам атрымаць кантроль над дзецьмі:

> *«...Для того, чтобы забрать детей, он использовал такие способы давления, как обвинение в различных экстремистских преступлениях своей жены...».*

Дадатковым фактарам уразлівасці становіцца і эканамічнае становішча жанчын. Эксперт_кі адзначаюць, што ў многіх выпадках жанчыны маюць менш фінансавых рэсурсаў для аплаты адвакатаў і падтрымкі падчас следства і суда, а партнёры пасля затрымання могуць фактычна адмаўляцца ад удзелу ў вырашэнні гэтых пытанняў:

> *«...Женщина чаще выступает в материальном плане в более уязвимом положении... А мужчины чаще имеют свойство после неприятностей у жены абстрагироваться, не участвовать в финансировании, в оплате адвокатов и прочем».*

У выніку спалучэнне інстытуцыйных умоў утрымання, гендарных стэрэатыпаў і сацыяльных фактараў уразлівасці стварае сітуацыю, у якой жанчыны-абвінавачаныя і асуджаныя могуць сутыкацца з дадатковымі формамі прыніжэння і кантролю, якія выходзяць за межы фармальнага пакарання.

14. Дыскрымінацыя жанчын у месцах несвабоды ў Беларусі: аналітычны даклад за 2020–2025 гады / [аўтарскі калектыў; праваабарончая ініцыятыва RPF]. — 2026. — 108 с.

15. Дыскрымінацыя жанчын у месцах несвабоды ў Беларусі: аналітычны даклад за 2020–2025 гады / [аўтарскі калектыў; праваабарончая ініцыятыва RPF]. — 2026. — 108 с.

# ІНСТЫТУЦЫЙНЫЯ ДЭФІЦЫТЫ

Пад «інстытуцыйнымі дэфіцытамі» ў гэтым раздзеле маюцца на ўвазе не асобныя выпадкі парушэнняў, а сістэмныя недахопы ў правілах, працэдурах і інстытуцыянальнай культуры крымінальнай юстыцыі, якія робяць гендарныя рызыкі другаснымі. Гэта разрыў паміж фармальна замацаванымі гарантыямі і іх рэальнай працай: ці існуюць абавязковыя алгарытмы дзеянняў, ці дзейнічаюць механізмы абароны і нагляду і ці здольныя інстытуты распазнаваць і прадухіляць другасную віктымізацыю, дыскрымінацыю і прыніжэнне ў крымінальным працэсе. У сукупнасці гэтыя фактары фарміруюць структурны разрыў паміж прынцыпам роўнасці перад законам і рэальным досведам жанчын у сістэме крымінальнай юстыцыі.

## 1. Адсутнасць гендарна-адчувальных працэдур і фармальная нейтральнасць заканадаўства

Беларусь з’яўляецца ўдзельніцай міжнародных дамоў у галіне правоў чалавека, якія ўстанаўліваюць абавязацельствы па недапушчэнні дыскрымінацыі і забеспячэнні гендарнай роўнасці. Агульная рэкамендацыя № 33 Камітэта ААН па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын разглядае доступ да правасуддзя як сістэму, у якой якасць, даступнасць і падсправаздачнасць павінны забяспечваць не толькі фармальную, але і фактычную роўнасць.

На нацыянальным узроўні Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь гарантуе роўнасць грамадзян перад законам (арт. 22) і недапушчальнасць дыскрымінацыі па прыкмеце полу (арт. 32). Аднак у крымінальна-працэсуальным заканадаўстве і практыцы яго прымянення адсутнічаюць спецыяльныя нормы і абавязковыя працэдуры, якія ўлічваюць гендарную спецыфіку, прадухіляюць другасную віктымізацыю і забяспечваюць доступ да псіхалагічнай падтрымкі для пацярпелых. У выніку агульныя гарантыі роўнасці часта застаюцца фармальнымі, а рашэнні ў канкрэтных справах прымаюцца на падставе дыскрэцыі правапрымяняльных органаў. Нягледзячы на рэгулярную справаздачнасць перад міжнароднымі органамі, эксперты адзначаюць, што міжнародныя стандарты гендарнай роўнасці слаба інтэграваныя ў практыку крымінальнага правасуддзя[16].

## 2. Інстытуцыйная культура і гендарныя стэрэатыпы

Нават у тых выпадках, калі прававыя інструменты і агульныя гарантыі роўнасці фармальна існуюць, яны не становяцца эфектыўным механізмам абароны без зменаў у інстытуцыянальнай культуры і прафесійных стандартах. У правапрымяняльнай практыцы гэта азначае, што патрыярхальныя ўяўленні і гендарныя стэрэатыпы працягваюць уплываць на ацэнку фактаў, выбар працэсуальных дзеянняў і прыняцце рашэнняў.

Такія ўяўленні могуць праяўляцца ў працы розных удзельнікаў сістэмы: ад следчых і пракурораў да адвакатаў і суддзяў. Пры адсутнасці сістэмнай падрыхтоўкі па гендарна-абумоўленым гвалце і прадухіленні другаснай віктымізацыі прадстаўнікі прававой сістэмы нярэдка кіруюцца сацыяльнымі стэрэатыпамі або асабістымі ўяўленнямі пра «нармальныя» гендарныя ролі. У выніку пацярпелыя і іншыя ўдзельніцы працэсу могуць не атрымліваць траўма-інфармаваных і гендарна-адчувальных падыходаў, неабходных для эфектыўнай абароны іх правоў.

## 3. Дэфіцыт механізмаў абароны і празрыстасці

Сур’ёзным абмежаваннем доступу да абароны стала звужэнне міжнародных каналаў прававой дапамогі. Пасля выхаду Беларусі ў 2023 годзе з Факультатыўнага пратаколу да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх

16. BHR Agenda and Authoritarian Regimes: The Case of Political and Human Rights Crisis in Belarus Since 2020 // Business and Human Rights Journal. — 2023. — Vol. 8, Issue 1. — (дата звароту: 13.03.2026). («Агенда ў сферы бізнесу і правоў чалавека і аўтарытарныя рэжымы: выпадак палітычнага і праваабарончага крызісу ў Беларусі з 2020 года»).

і палітычных правах грамадзяне фактычна страцілі адзін з асноўных механізмаў індывідуальных скаргаў у міжнародныя органы пасля вычарпання ўнутраных сродкаў абароны. У гэтай сітуацыі Камітэт ААН па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын застаецца адзіным дагаворным органам, у які з Беларусі ўсё яшчэ магчыма падаваць індывідуальныя скаргі. Гэта прыводзіць да парадаксальнай сітуацыі, калі механізм, першапачаткова прызначаны для абароны ад гендарнай дыскрымінацыі, вымушана становіцца адным з нямногіх міжнародных каналаў прававой абароны ўвогуле.

Дадатковым фактарам, які абмяжоўвае магчымасці для аналізу і распрацоўкі палітык, з'яўляецца закрытасць дзяржаўнай статыстыкі па хатнім гвалце. Адсутнасць адкрытых даных пра колькасць зваротаў, расследаванняў і вынікі судовай практыкі не дазваляе ацаніць маштаб праблемы і эфектыўнасць існуючых працэдур. Гэта зніжае падсправаздачнасць дзяржаўных органаў і робіць праблему менш бачнай у публічнай палітыцы.

## 4. Дэмантаж інстытуцый падтрымкі

Дэфіцыт механізмаў абароны ўзмацняецца дэмантажам недзяржаўных і прафесійных інстытутаў, якія раней часткова кампенсавалі недахоп дзяржаўных механізмаў.

Да канца 2025 года ў Беларусі было ліквідавана або прымушана да самаліквідацыі не менш за 1 990 некамерцыйных арганізацый розных арганізацыйна-прававых формаў (публічныя аб'яднанні, фонды, установы, прафсаюзы, партыі)[17]. Паводле маніторынгаў жаночых і праваабарончых структур, сярод іх — дзясяткі НДА, якія забяспечвалі жанчынам доступ да юрыдычнай і псіхалагічнай дапамогі, у тым ліку не менш за 31 арганізацыю, што спецыялізавалася на падтрымцы жанчын[18]. Гэтыя структуры фактычна выконвалі функцыю «практычнага мосту» паміж фармальнымі правамі і магчымасцю імі скарыстацца: забяспечвалі канфідэнцыйныя каналы звароту, юрыдычнае суправаджэнне і бяспечныя маршруты дапамогі. Іх ліквідацыя істотна звузіла магчымасці для атрымання незалежнай падтрымкі.

Адначасова са знішчэннем НДА 141 адвакат страцілі права на практыку па палітычных падставах, сярод іх не менш за 52 жанчыны[19]. Гэта крытычна абмяжоўвае доступ жанчын да кваліфікаванай юрыдычнай дапамогі і звужае магчымасць для эфектыўнай абароны ў «палітычных» справах.

У сукупнасці з дэградацыяй пракурорскага нагляду гэта стварае сітуацыю, калі механізмы абскарджання працэсуальных парушэнняў становяцца фармальнымі, а інстытуцыйныя «стрымліванні і супрацьвагі» ў крымінальным працэсе фактычна перастаюць працаваць.

17. Monitoring of the situation with freedom of association and the status of civil society organizations in the Republic of Belarus, December 2025. — Minsk: Lawtrend, 2026. — 18 p. — (дата звароту: 15.03.2026)

18. Маніторынг сітуацыі са свабодай асацыяцый і становішчам арганізацый грамадзянскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь. — Май 2025. — Мінск: Lawtrend, 2025. — 16 с.;
Справаздача аб выкананні Рэспублікай Беларусь Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх форм дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын / падрыхтавана кааліцыяй беларускіх НДА і ініцыятыў. — 2025. — 20 с.

19. Справаздача аб выкананні Рэспублікай Беларусь Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх форм дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын / падрыхтавана кааліцыяй беларускіх НДА і ініцыятыў; Беларускі Хельсінкскі Камітэт [і інш.]. — 2025. — 20 с. — (Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (CEDAW), 90-я сесія).

# ВЫСНОВЫ

Праведзены аналіз паказвае, што гендарнае вымярэнне крымінальнага працэсу ў Беларусі мае сістэмны характар і пасля 2020 года ўсё часцей спалучаецца з палітычна матываваным пераследам. Жанчыны сутыкаюцца не толькі з агульнымі дэфіцытамі крымінальнай юстыцыі, але і з дадатковымі ўразлівасцямі на скрыжаванні палітычнага ціску, гендарных стэрэатыпаў і сацыяльных роляў.

Фармальная «нейтральнасць» нормаў не гарантуе роўнасці: у практыцы гендарныя стэрэатыпы ўплываюць на ацэнку паводзін і пакаранняў, ролю жанчыны ў працэсе і выбар працэсуальных дзеянняў, таму аднолькавыя працэдуры могуць даваць розныя вынікі. Ва ўмовах палітызацыі працэсуальныя механізмы выкарыстоўваюцца як інструменты кантролю і запалохвання, а мацярынства, сацыяльная залежнасць і рызыка стыгматызацыі ўзмацняюць ціск, робячы крымінальны працэс крыніцай уразлівасці і рэтраўматызацыі. Асабліва востра гэта праяўляецца ў працы з пацярпелымі: недахоп траўма-інфармаваных, гендарна-адчувальных і бяспечных працэдур павышае рызыку другаснай віктымізацыі і зніжае гатоўнасць жанчын звяртацца па абарону.

У больш шырокім плане даследаванне выяўляе сістэмныя дэфіцыты: разрыў паміж дэклараванай роўнасцю і рэальнымі гарантыямі абароны, адсутнасць абавязковых гендарна-адчувальных працэдур, шырокая дыскрэцыйнасць пры слабой падсправаздачнасці і аслабленне інстытутаў абароны і нагляду. Дадаткова ўплываюць працэсуальныя «шэрыя зоны» — маніпуляванне статусамі і выкарыстанне сумежных працэдур для ізаляцыі і ціску. У выніку фактычны доступ жанчын да правасуддзя становіцца няроўным.

Павышэнне гендарнай адчувальнасці ў крымінальнай юстыцыі патрабуе змяненняў у заканадаўстве, інстытуцыйных практыках і інфраструктуры незалежнай падтрымкі. У сучасных умовах унутры Беларусі магчымасці для рэалізацыі такіх зменаў істотна абмежаваныя, таму гаворка ідзе хутчэй пра накірункі на будучыню. Сярод іх — поўнае ўлічванне міжнародных стандартаў абароны ад гендарна-абумоўленага гвалту, пераход да разумення сексуалізаванага гвалту праз адсутнасць згоды, а таксама замацаванне траўма-інфармаваных працэдур для ўразлівых пацярпелых.

Аднак без ранняга доступу да абаронцы, незалежнай адвакатуры, эфектыўнага пракурорскага нагляду і абавязковых стандартаў працы з пацярпелымі нават прагрэсіўныя нормы застануцца дэкларатыўнымі; гэта датычыцца і ўмоў утрымання жанчын у месцах несвабоды, дзе прыватнасць, гігіена і меддапамога — базавыя гарантыі годнасці. Важную ролю ў будучых зменах можа адыграць незалежная падтрымка (праваабарончыя і сацыяльныя ініцыятывы), якая дакументуе парушэнні, дае юрыдычнае суправаджэнне і назапашвае экспертызу, нават калі цяпер не можа працаваць унутры краіны.

Такім чынам, гендарная адчувальнасць у крымінальнай юстыцыі выступае не ізаляванай тэмай, а індыкатарам таго, наколькі прававая сістэма здольная выконваць сваю асноўную функцыю — абараняць годнасць чалавека і забяспечваць справядлівы працэс. У гэтым сэнсе гендарнае вымярэнне дазваляе ўбачыць не толькі праблемы, з якімі сутыкаюцца жанчыны, але і больш шырокія межы функцыянавання правасуддзя ў аўтарытарным кантэксце.

# АЎТАРКА



**Лілія Беразюк**

Магістарка права, незалежная даследчыца.

Funded by the European Union

Погляды, выказаныя ў гэтым матэрыяле, з’яўляюцца адказнасцю аўтараў і не абавязкова адлюстроўваюць пазіцыю каманды Банка Ідэй.